Дзіна ДУБІНІНА,
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры методык дашкольнай адукацыі,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт*
*імя Максіма Танка*

# НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СІМВАЛЫ БЕЛАРУСІ

## ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА АДУКАЦЫЙНЫХ АБЛАСЦЯХ «ДЗІЦЯ І ПРЫРОДА» І «ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

*(Заканчэнне. Пачатак у № 10 за 2017 год.)*

**Праграмныя задачы:** фарміраваць у дзяцей уяўленні пра багацце прыроды Беларусі, пра яе сімвалы; замацоўваць уменні падбіраць дзеясловы-гукаперайманні, ствараць апісальныя апавяданні; развіваць пазнавальную актыўнасць; выхоўваць патрыятычныя пачуцці і павагу да нацыянальных сімвалаў Беларусі.

**Матэрыял:** малюнак карты Беларусі з прадстаўнікамі расліннага і жывёльнага свету, карткі з выявамі птушак (жаваранак, сава, дзяцел, крумкач, зязюля), раслін лугу (рамонак, званочак, смолка), раслін лесу (бяроза, дуб, елка, ляшчына), сімвалаў Беларусі (сасна, зубр, бусел, кветкі лёну, канюшыны, васілёк), ілюстрацыі з выявамі эмблем «Славянскага базару» ў Віцебску і Чэмпіянату свету па хакеі 2014 года, фішкі.

### Ход занятказ

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Наша родная Беларусь прыгожая і непаўторная. Паслухайце верш Артура Вольскага, які так і называецца «Непаўторны край».

То ялінкі, то сасонкі
Падпіраюць небакрай...
Прыгажэйшае старонкі
Не знайсці, як не шукай.
На бярозе — белы бусел.
Пад бярозаю — ручай.
А завецца Беларуссю
Непаўторны родны край.

Як называе паэт Беларусь? *(Адказы дзяцей.)* І сапраўды, наш край непаўторны, найпрыгажэйшы, бо ён для нас — родны. *(Дэманструе малюнак карты Беларусі з прадстаўнікамі расліннага і жывёльнага свету.)* Пра якія дрэвы расказваецца ў вершы? Ці ёсць яны на карце Беларусі? Якая птушка апісваецца ў вершы? Ці знайшлі вы гэтую птушку на карце? *(Адказы дзяцей.)*

*Дзеці паўтараюць апошнія чатыры радкі.*

### Гульня «Хто як крычыць»

Дзецям прапануюць падабраць дзеясловы-гукаперайманні па ўзоры:

Верабей — чырык-чырык — чырыкае.
Воўк — ву-у-у — вые.
Мядзведзь — р-р-р-р — раве (рычыць).
Зубр — рох-рох — рохкае.
Змяя — ш-ш-ш-ш — шыпіць.
Журавель — курлы-курлы — курлыча (курлыкае).
Бусел — клё-клё-клё — клякоча.
Зязюля — ку-ку, ку-ку — кукуе (куе).
Сава — ку-га, ку-га — кугакае.
Жук — дж-дж-дж-дж — гудзіць.
Камар — з-з-з-з — звініць.
Цвыркун — цвырк-цвырк — цвыркае (стракоча).
Муха — зу-зу-зу — зумкае, гудзіць.

### Фізкультмінутка «Бусел»

Бусел у Афрыцы гарачай
Родную зямельку бачыў —
*(Прыкладаюць левую, потым правую руку да лба — «выглядаюць», гойдаюцца ў той жа бок.)*

Зноўку з выраю вярнуўся
Да любімай Беларусі.
*(«Ляцяць» улева, потым управа.)*

Выгадуе дзетак летам
І пакіне свой палетак.
*(Рукі ў бакі, робяць кругавыя рухі тазам улева-ўправа.)*

Прыляціць увесну. Бусел
Заўжды верны Беларусі.
*(Падскокваюць на месцы ў чаргаванні з хадзьбой.)*

**В. Швед** *(перапрац.)*

### Гульня «Птушыныя загадкі»

Дзеці сумесна з дарослым разглядаюць карткі з выявамі птушак (бусел, жаваранак, сава, дзяцел, крумкач, зязюля), называюць іх, а потым раскладваюць на дыване. Выхавальнік дашкольнай адукацыі загадвае загадку, дзеці моўчкі адгадваюць яе, бягуць да адпаведнай выявы і групуюцца вакол яе, а потым гучна называюць адгадку.

З вясновым цяплом
З поўдня вярнуўся
І ладзіць на дрэве жытло
Даўгадзюбы... *(бусел).*

Пад аблокі ўзлятае
І прыход вясны вітае —
Льецца спеў высокі, чысты,
Мілагучны, прамяністы. *(Жаваранак.)*

Стракаты, крылаты
Руплівец лясны,
Лекар заўзяты
Хворай сасны. *(Дзяцел.)*

Ляціць, крычыць ён:
— Крум-крум-крум!
А ў гэтым крыку —
Страх і сум. *(Крумкач.)*

Хаткі не будуе,
Дзетак не гадуе.
У чужым гняздзе
Яйка пакладзе.
Па лясах лятае,
Некага гукае. *(Зязюля.)*

Спіць удзень яна,
Бо не бачаць вочы,
Налятаецца спаўна,
Пашчыруе ўночы. *(Сава.)*

**М. Пазнякоў**

**В.д.а.** Малайцы! Якая з птушак — сімвал Беларусі? *(Бусел.)*

### Гульня «Пазнай па апісанні»

Дзеці сумесна з дарослым разглядаюць карткі з выявамі раслін лугу (рамонак, васілёк, званочак, канюшына, смолка) і лесу (сасна, бяроза, дуб, елка, ляшчына) і называюць іх. Потым выхавальнік дашкольнай адукацыі апісвае расліну. Той, хто здагадаўся першым, атрымлівае фішку, у каго больш фішак — пераможца.

**В.д.а.** Сярод раслін, якія мы з вамі разглядалі, ёсць нацыянальныя сімвалы Беларусі, здагадаецеся, якія? *(Сасна, кветкі лёну, канюшыны, васілёк.)* Паспрабуйце растлумачыць свой выбар. Дзе вы маглі бачыць нацыянальныя сімвалы Беларусі? *(Адказы дзяцей.)* Эмблемы з нацыянальнымі сімваламі Беларусі ўжываюцца на фестывалях, спартыўных спаборніцтвах, дзяржаўных акцыях і мерапрыемствах. Выкарыстанне сімвалаў Беларусі падкрэслівае, што ўдзельнікі мерапрыемства з Беларусі або што мерапрыемства праходзіць менавіта ў ёй.

*Разглядаюць ілюстрацыі з выявамі эмблем «Славянскага базару» ў Віцебску, Чэмпіянату свету па хакеі 2014 года.*

### Гульня «Сімвалы Беларусі»

Выхавальнік дашкольнай адукацыі дэманструе карткі з выявамі, калі дзеці бачаць сімвал Беларусі (сасна, зубр, бусел, кветкі лёну, канюшыны, васілёк), называюць яго і пляскаюць у далоні.

# РАДЗІМЫ ВЕЛІЧНЫ СЦЯГ

## ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА АДУКАЦЫЙНЫХ АБЛАСЦЯХ «ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА» І «РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Праграмныя задачы:** узбагачаць актыўны слоўнік дзяцей, уяўленні пра Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь; замацоўваць уменне састаўляць апісальнае апавяданне; выхоўваць паважлівыя адносіны да сімвалаў беларускай дзяржавы, грамадзянскасць.

**Матэрыял:** 2 камплекты палосак (вузкія і шырокія зялёнага, чырвонага, белага, жоўтага і блакітнага колераў, белыя з арнаментам чырвонага, чорнага і зялёнага колераў), карткі з выявамі сцягоў іншых краін і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

### Ход заняткаў

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.)** *(дэманструе картку з выявай сцяга).* Паглядзіце на картку. Гэта Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Ці бачылі вы яго раней? Дзе? *(Адказы дзяцей.)* Давайце разгледзім яго больш пільна.

Дзяржаўны сцяг мае форму прамавугольніка. На ім дзве гарызантальныя палоскі: верхняя — шырокая, яе колер... *(чырвоны)*, ніжняя — вузкая, яе колер... *(зялёны)*. Адна палоска верцікальная, яе колер... *(белы)*. На палосцы размешчаны... *(беларускі нацыянальны арнамент)*, яго колер... *(чырвоны)*. Да Дзяржаўнага сцяга трэба ставіцца з павагай, беражліва, ганарыцца ім.

### Гульнявое практыкаванне «Сцяг маёй краіны»

Дзецям прапануюць знайсці сярод картак з выявамі сцягоў іншых краін картку з выявай Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і адказаць, па якіх прыкметах яны пазналі яго.

### Гульня «Складзі сцяг»

Дзеці падзяляюцца на дзве каманды, кожная атрымлівае камплект палосак (вузкія і шырокія зялёнага, чырвонага, белага, жоўтага і блакітнага колераў, белыя — з арнаментам чырвонага, чорнага і зялёнага колераў). Неабходна выбраць патрэбныя і скласці з іх сцяг Беларусі. Калі заданне выканана, на дошцы размяшчаюць картку з выявай Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, каб дзеці ацанілі правільнасць выканання. Перамагае каманда, якая лепш і хутчэй справілася з заданнем.

### Фізкультмінутка «Колеры сцяга»

Мы захапляемся
Колерам белым —
Снег, як узімку,
Зямлю ўсю засцеле.
*(Падняць праз бакі рукі над галавой, паступова спераду апусціць, імітуючы як падае снег, нахіліцца ўперад.)*

Любім вясновы
Зялёны колер,
Калі адмыслова
Квітнее ваколле.
*(Рукі ў бакі, зрабіць кругавыя рухі тазам улева-ўправа.)*

А колер чырвоны —
Колер світання.
За поступ наш годны —
Сімвал змагання.
*(Крочыць на месцы ў чаргаванні з падскокамі.)*

**М. Пазнякоў**

**В.д.а.** Сцяг берагуць і абараняюць. Ён прадстаўляе Беларусь у свеце, упрыгожвае вуліцы і плошчы ў вялікія святы, лунае ў небе ў час Алімпійскіх гульняў.

### Гульня «Так ці не»

Дзецям прапануюць шэраг выказванняў. Калі выхаванцы згодны з імі, кажуць «так», не згодны — «не», і даюць правільны адказ.

**Прыклады выказванняў:**

- Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь — гэта трохвугольнае палотнішча. *(Не, прамавугольнае палотнішча.)*
- На Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь ёсць выявы кветак ільну і канюшыны. *(Не, на ім кветак зусім няма.)*
- На Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь ёсць арнамент чорнага колеру. *(Не, чырвонага колеру.)*
- Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь мае чырвоны, зялёны і белы колеры. *(Так.)*
- Да Дзяржаўнага сцяга трэба ставіцца паважліва і ганарыцца ім. *(Так.)*

**В.д.а.** Малайцы! Вы — сапраўдныя грамадзяне сваёй краіны, якія ведаюць і паважаюць яе дзяржаўныя сімвалы.

# ГЕРБ РОДНАЙ КРАІНЫ

## ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА АДУКАЦЫЙНЫХ АБЛАСЦЯХ «ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА» І «РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Праграмныя задачы:** узбагачаць актыўны слоўнік дзяцей, уяўленні пра Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь, аб тым, як раней выраблялі льняную вопратку; выхоўваць паважлівыя адносіны да сімвалаў беларускай дзяржавы, грамадзянскасць.

**Матэрыял:** ілюстрацыя з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, ілюстрацыі да апавядання «Як кашуля ў полі вырасла» К. Ушынскага, ільняныя рэчы, карткі з выявамі: Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і гербаў розных краін, кветак (лён, канюшына, васілёк, рамонак, званочак, незабудка).

### Ход заняткаў

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Што адлюстравана на малюнку?

*(Герб Беларусі.)* Вы ўжо ведаеце, што герб складаецца са шматлікіх сімвалаў і знакаў. З якіх? *(Адказы дзяцей.)* Сапраўды, зялёны контур тэрыторыі Рэспублікі Беларусь паказаны так, як наша краіна адлюстравана на геаграфічнай карце. На што падобны контур межаў Беларусі? Чаму контур зялёнага колеру? *(Адказы дзяцей.)* Зялёны колер — гэта колер прыроды, нашых лясоў і палёў, беларускай зямлі, колер дабра, развіцця, міру. Ён падкрэслівае, што Беларусь — мірная краіна.

Зялёны контур межаў Беларусі адлюстраваны на гербе ў залатых промнях узыходзячага сонца, якое асвятляе і саграванае нашу родную зямлю. Промні сонца над зямным шарам — гэта яднанне зямлі і сонца, галоўны знак жыцця. У межах зямнога шара Беларусь — маленькая краіна, але для беларусаў яна самая прыгожая і самая родная.Чаму мы кожную раніцу чакаем сонейка? *(Адказы дзяцей.)*

Паслухайце верш Алега Старынчыка пра сонейка:

Сонца-сонейка ласкавае,
Пакажы ўсё на свеце цікавае!
Мы чакаем цябе з кожнай раніцай,
Без цябе не пяецца, не марыцца.

Якія прыгожыя і ласкавыя словы вы ведаеце пра сонейка? *(Адказы дзяцей.)* Так, сонейка ласкавае, залаценькае і ўсяму свету міленькае, таму людзі любяць і клічуць яго. Давайце і мы заклічам сонейка.

## Карагодная гульня «Сонейка-сонца»

Сонейка-сонца,
*(Дзеці вядуць карагод.)*

Залатое донца,
*(Спыняюцца тварам да цэнтра круга, пляскаюць у далоні.)*

Не хавайся ў бары,
*(Нахіляюцца, выцягваюць рукі ўперад.)*

А гары, гары, гары!
*(Паступова выпрамляюцца, устаюць на дыбачкі, цягнуцца ўверх.)*

*Гульня паўтараецца двойчы.*

**В.д.а.** На зямным шары ў краінах жыве шмат дзяцей. У іх розны колер скуры, розныя імёны, яны размаўляюць на сваёй роднай мове, але ўсе яны хочуць жыць мірна, у ладзе і згодзе.

*Выхавальнік дашкольнай адукацыі знаёміць дзяцей з вершаванымі радкамі Уладзіміра Карызны:*

Вы сёння
Пакуль яшчэ дзеці.
А вырасцеце
Праз час —
Мір
На планеце
Будзе
Залежыць
Ад вас.
Я ведаю,
Сонца ў Сусвеце
Не зможа
Ніхто патушыць,
Пакуль
На зямной планеце
Дзеці
Будуць
Дружыць!

## Фізкультмінутка

Гасцёўня, гасціннасць і госці —
У словах ёсць роднае штосьці.
*(Крочаць на месцы ў чаргаванні з падскокамі.)*

Гасцёўня збірае гасцей:
Гасцюйце ў нас як часцей!
*(Прысядаюць некалькі разоў.)*

Гасцёўня гасцямі багата.
Вітаць вас — для нас гэта свята.
*(Нахіляюцца ўперад і назад.)*

**В. Жуковіч**

## Гульнявое практыкаванне «Кветкі на гербе»

Дзецям прапануюць разгледзець карткі з выявамі кветак (лён, канюшына, васілёк, рамонак, званочак, незабудка), назваць кветкі, знайсці, якія з іх адлюстраваны на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь.

**В.д.а.** Паглядзіце яшчэ раз на герб нашай краіны. Выяву герба абрамляе... *(вянок з каласоў)*, пераплецены з аднаго боку кветкамі... *(канюшыны)*, з другога — ... *(кветкамі лёну)*. Для чаго на Беларусі здавён сеялі канюшыну? *(Каб забяспечыць ежай жывёл, якія дапамагалі выконваць розныя гаспадарчыя работы, давалі людзям малако, мяса.)*

Адгадайце загадку:
У зямлі расце, блакітам цвіце,
Хто яго збірае, той сукенку мае. *(Лён.)*

Ці адлюстраваны лён на гербе Беларусі? *(Так.)* Якога колеру кветачкі лёну? *(Блакітныя, сінія.)* У Беларусі шмат палёў, дзе расце лён. Назавіце прадметы побыту і адзення, зробленыя з ільняной тканіны. *(Ручнік, абрус, сурвэтка, бялізна.)* Беларусы з даўніх часоў насілі льняное адзенне. Яно вельмі зручнае і трывалае. Часта можна пачуць: «Кашуля ў полі вырасла». Чаму так гавораць? *(Дзеці выказваюць свае меркаванні.)*

*Педагагічны работнік знаёміць дзяцей з апавяданнем «Як кашуля ў полі вырасла» К. Ушынскага і ілюстрацыямі да яго.*

**В.д.а.** Так рабілі льняное палатно раней. У наш час у Оршы пабудаваны вялікі льнокамбінат, куды звозяць лён з усіх палёў краіны. Там яго апрацоўваюць і вырабляюць ільняную тканіну, з якой шыюць прыгожае адзенне для дзяцей і дарослых.

### Гульнявое практыкаванне «Льняныя рэчы»

Дзецям прапануюць знайсці ў групавым пакоі рэчы з ільну. Той, хто больш і хутчэй знойдзе — пераможца.

**В.д.а.** Паглядзіце на герб Беларусі. Мы ўжо адзначалі, што ён уяўляе сабой геаграфічны... *(контур Беларусі)* у промнях... *(сонца)* над... *(зямным шарам)*. Зверху размешчана чырвоная пяціканцовая... *(зорка)*. Выяву герба абрамляе вянок з... *(каласоў)*, пераплеценых з аднаго боку... *(кветкамі канюшыны)*, з другога — ... *(кветкамі лёну)*. Каласы абвітыя чырвона-зялёнай... *(стужкай)*, на якой золатам напісана назва нашай дзяржавы... *(Рэспубліка Беларусь)*.

### Гульнявое практыкаванне «Герб роднай краіны»

Дзецям прапануюць паглядзець на карткі з выявамі гербаў розных краін і знайсці сярод іх герб Беларусі.

**В.д.а.** Што дапамагло вам пазнаць герб роднай краіны? Дзе можна яго ўбачыць? *(Адказы дзяцей.)*

# РАДАВОД

## СІТУАЦЫЯ ЗНОСІН ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Мэта:** фарміраванне ў дзяцей уяўленняў пра радавод.

**Матэрыял:** па колькасці дзяцей: лісты са схемай радавога дрэва, наборы каляровых алоўкаў.

*Выхавальнік дашкольнай адукацыі знаёміць дзяцей з урыўкамі з апавядання «Твой род, твая Радзіма» В. Віткі.*

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Мама, тата, сёстры, браты — яны вашы самыя родныя, блізкія людзі. Добра, калі ў вас ёсць бабуля, дзядуля — гэта вашы дарагія родныя. Калі іх ужо няма, ці ведаеце вы, хто яны былі, як іх звалі? Ці ёсць у вас дома іх фотаздымкі? Ці ёсць у вас прадметы, зробленыя іх рукамі? *(Адказы дзяцей.)* Род і народ з'яднаныя адным дарагім для ўсіх словам — Радзіма. Паслухайце радкі з верша «Радзіма» Д. Бічэль:

...Радзіма!
Тата, мама і браты,
Сястра, бабуля, дзед
І шмат радні
Зрабілі ўсё,
Каб меў Радзіму ты.
Яе высокі гонар не ўрані.

Да чаго заклікае аўтар? Што гэта значыць? *(Адказы дзяцей.)*

Наладжванне гутаркі «Я і мая сям'я»: звярнуцца да кожнага дзіцяці з пытаннямі:

- Тваё імя — ... .
- Тваё прозвішча — ... .
- Твае самыя родныя людзі — гэта ... .
- Як завуць тваю бабулю (твайго дзядулю)?

**В.д.а.** Запытайцеся ў сваіх бацькоў пра родзічаў — і вы абавязкова даведаецеся пра цікавыя і павучальныя гісторыі з жыцця.

Радавод падобны на дрэва, знізу якога месцяцца продкі (дзядуля, бабуля, маці, тата), а ўверсе — нашчадкі (дзеці і іх будучыя сыны і дочкі).

*Дзецям раздаюць лісты са схемай радавога дрэва і наборы каляровых алоўкаў, каб яны намалявалі партрэты сваіх родных. Далей — абмеркаванне малюнкаў і роднасных сувязей.*

# СПАДАР БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ

## СІТУАЦЫЯ ЗНОСІН ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Мэта:** узбагачэнне ўяўленняў дзяцей пра сімвал Беларусі — белавежскага зубра.

**Матэрыял і абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя «Усё пра зубра», па

колькасці дзяцей: размалёўкі «Зубр», наборы каляровых алоўкаў.

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Адгадайце, пра каго мы будзем размаўляць:

Па лясах блукае статак
Волатаў і немаўлятак.
Гэта пушчы спадары —
Белавежскія... *(зубры).*

**У. Мазго**

Малайцы! Паслухайце радкі з верша «Радзіма» Д. Бічэль:

Радзіма —
Нівы, рэкі і бары,
Бярозавікам вецер набрыняў.
У Белавежы волаты-зубры,
А вунь мацуе ножкі зубраня...

Што вы ведаеце пра галоўнага жыхара Белавежскай пушчы? *(Адказы дзяцей.)*

*Дэманструецца мультымедыйная прэзентацыя «Усё пра зубра», якая суправаджаецца расказам выхавальніка дашкольнай адукацыі.*

**В.д.а.** Зубр — спакойная, велічная жывёла. Зубрыны род існуе тысячы гадоў. Найбольшая колькасць зуброў жыве ў Белавежскай пушчы. Калі вы захочаце ўвачавідкі яго ўбачыць, адпраўляйцеся менавіта туды.

Шмат зубр выхадзіў бароў,
Горкіх папагрыз асінак,
І таму сярод звяроў
Самы дужы стаў асілак...

**В. Вітка** *(перапрац.)*

Ці бачылі вы зубра? Яго выяву? Дзе? *(Адказы дзяцей.)* Выяву зубра можна ўбачыць пры заездзе ў Нацыянальны аэрапорт, на цукерках, на эмблеме хакейнага клуба. Вялікі драўляна-металічны зубр сустракае кожнага, хто праязджае па дарозе Мінск—Брэст. Назву «Зубраня» носіць вядомы дзіцячы лагер. Выяву зубра можна ўбачыць на вялікім беларускім самазвале.

...У нас на кожным самазвале
Зіхаціць яго партрэт.
Сапраўды, асілак ён —
Падымае сорак тон...

**В. Вітка** *(перапрац.)*

Зубр — вялікая і моцная жывёла, нацыянальны сімвал Беларусі. Мы ганарымся тым, што такія магутныя звяры жывуць у нашай краіне, у Белавежскай пушчы.

*Дзецям прапануюць размалёўкі «Зубр».*

# «ПАЛЕТКАЎ КРАСА — ВАСІЛЁК»

## СІТУАЦЫЯ ЗНОСІН ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Мэта:** узбагачэнне ўяўленняў дзяцей пра сімвал Беларусі — васілёк.

**Матэрыял і абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя «Васілёк», па колькасці дзяцей: папяровыя сілуэты кашуль, наборы каляровых алоўкаў.

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).**

Сіні-сіні матылёк
Вам відзён яшчэ здалёк.
Па яго вы не бяжыце,
Ён стаіць, чакае ў жыце.
Так і просіцца ў вянок
Сіні-сіні... *(васілёк).*

**Н. Сторажава**

На што падобны сіні васілёк? *(Адказы дзяцей.)* Сінія васількі растуць толькі ў жытнёвых палях, гэта вельмі мілыя, прыгожыя кветкі, яны ўвасабляюць сціпласць, прыязнасць, гасціннасць беларускага народа.

*Дэманструецца мультымедыйная прэзентацыя «Васілёк», якая суправаджаецца расказам выхавальніка дашкольнай адукацыі.*

**В.д.а.** Палявая кветка васілёк з'яўляецца сімвалам Беларусі. Вось як расказвае пра яго ў сваім вершы А. Дзеружынскі:

Стаіць,
Выглядаючы з жыта,
Як зорачка-знічка
Здалёк,
Што ўпала
Іскрынкай
З блакіту,
Палеткаў краса —
Васілёк.
Стаіць,
Пагллядае з пагорка,
Як зорка
Аднекуль здалёк,
Часцінка
Любімай старонкі,
Часцінка зямлі —
Васілёк.

Васілёк вышывалі на ручніках і святочнай вопратцы. Перад пачаткам уборкі ўраджаю вязалі першы сноп, ставілі ў чырвоным кутку хаты і ўпрыгожвалі васількамі. Дзяўчаты

любяць плесці вянкі з васількоў і кідаць іх у ваду падчас свята Івана Купалы.

Дзе вы бачылі выявы васілька? *(Адказы дзяцей.)* Выяву васілька можна ўбачыць на адзенні, на ручніках і абрусах, на цукерках. *(Дзеці разглядаюць адпаведныя выявы.)*

*Дзецям прапануюць упрыгожыць папяровыя сілуэты кашуль выявай васілька.*

# «НАД БЕЛАЙ РУССЮ — БЕЛЫ БУСЕЛ»

## СІТУАЦЫЯ ЗНОСІН ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Мэта:** узбагачэнне ўяўленняў дзяцей пра сімвал Беларусі — бусла.

**Матэрыял і абсталяванне:** мультымедыйная прэзентацыя «Бусел», па колькасці дзяцей: размалёўкі «Бусел», наборы каляровых алоўкаў.

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Адгадайце загадку:

Над балотамі клякоча —
У любві прызнацца хоча,
Мабыць, роднай Беларусі.
Называюць птушку... *(бусел).*

**У. Мазго**

Правільна, сёння мы будзем гаварыць пра бусла. *(Дэманструецца мультымедыйная прэзентацыя.)* Паглядзіце на яго і апішыце. *(Белая вялізная птушка з чорнымі канцамі крылаў, доўгай шыяй, доўгай тонкай чырвонай дзюбай і доўгімі чырвонымі нагамі.)*

Бусел — яшчэ адзін сімвал нашай краіны. Беларусь нават называюць «краінай пад белымі крыламі». Гэта птушка карыстаецца асаблівай павагай беларусаў. Лічыцца добрай прыкметай, калі бусел робіць гняздо і селіцца паблізу дома. Кажуць, што ён ахоўвае жыллё ад перуноў, вясну абвяшчае, прыносіць шчасце ў хату, дорыць бацькам дзетак. Гэта птушка — сімвал міру, сям’і, цішыні і спакою.

Паслухайце верш В. Лукшы пра бусла:

Над Белай Руссю —
Белы бусел
Ладуе спраўнае гняздо.
А гэта значыць,
Белай Русі
Жыць, нібы поўны песень дом.
Над Белай Руссю —
Белы бусел
З буслíхай ў вышыні нябёс.
А гэта значыць,
Белай Русі
Наканаваны шчасны лёс...

Ці з’яўляюцца буслы пералётнымі птушкамі? Што цікавага вы ведаеце пра бусла? *(Адказы дзяцей.)*

### Гульня «Бусел і жабкі»

Дзеці становяцца ў круг, «бусел» — пасярэдзіне, за кругам — 2—3 «жабкі». Дзеці спяваюць:

Ходзіць бусел па балоту,
Кліча жабак на работу.
Жабка кажа: «Не пайду!»
Бусел кажа: «Паваду!»

Дзеці падымаюць рукі ўверх («вароцікі»). «Жабкі» ўцякаюць, «бусел» даганяе.

*Дзецям прапануюць размалёўкі «Бусел».*

# «ЛЮБЛЮ Я ЛЕС, АДВЕЧНЫ БОР»

## СІТУАЦЫЯ ЗНОСІН ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (5—6 гадоў)

**Мэта:** узбагачэнне ўяўленняў дзяцей пра сімвал Беларусі — сасну.

**Матэрыял і абсталяванне:** мяч, слайды з выявамі карцін «Сосновый бор. Мачтовый лес в Вятской губернии», «Утро в сосновом бору», «На опушке соснового леса» І. Шышкіна, па колькасці дзяцей: размалёўкі «Сасна», наборы каляровых алоўкаў.

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Паслухайце радкі з верша Я. Коласа:

Люблю я лес, адвечны бор,
Дзе ўзносяць хвоі ўгору шапкі,
Дзе рассцілаюць елі лапкі
І востры верх мкнуць у прастор.

Што такое бор? *(Гэта стары сасновы лес.)* Як вы лічыце, чаму ён так спадабаўся паэту? А ці падабаецца сасновы бор вам? *(Адказы дзяцей.)*

Паглядзіце на карціны І. Шышкіна. *(Дэманструюцца слайды з выявамі карцін «Сосновый бор. Мачтовый лес в Вятской губер-*

*нии», «Утро в сосновом бору», «На опушке соснового леса».)* Якія фарбы выкарыстоўваў мастак, малюючы сосны, неба, зямлю і траву? Паглядзіце ўважліва на малюнак. Ці ёсць у сасновым бары кусты? Ці ёсць высокая трава, кветкі? Чаму? Ці хацелася б вам пабываць у сасновым бары? Што вы адразу адчулі б, калі б там апынуліся? Уявіце, што вы ў сасновым бары, раскажыце, што вы бачыце. *(Адказы дзяцей.)* Паспрабуйце апісаць сасну. *(Сасна высокая, прамая, рослая, тонкаствольная. Кара ствала сухая, шурпатая, шэра-карычневага колеру. Крона разгалістая, густая, кучаравая, пушыстая. Хваінкі шэра-зялёныя, размешчаны па дзве ў пучку. Хвоя мае духмяны пах.)*

**В.д.а.** Сасновыя бары вельмі часта сустракаюцца ў Беларусі, таму сасну вызначаюць як нацыянальны сімвал Беларусі.

Уявіце сабе, што ў сасновым бары мы сустрэлі мядзведзіцу з медзведзянятамі. Што яны любяць рабіць, як вы лічыце? *(Медзведзяняты любяць ласавацца мёдам і малінай і забаўляцца: лазіць па дрэвах, поўзаць, коўзацца, тузацца.)*

### Гульня «Што ў лесе расце, хто ў лесе жыве»

Дзеці становяцца кругам. Выхавальнік дашкольнай адукацыі задае пытанне: «Што ў лесе расце?» — і кідае мяч аднаму з дзяцей. Дзіця называе расліну і кідае мяч іншаму гульцу, пакуль ён зноў не трапіць да выхавальніка дарослага. Тады выхавальнік дашкольнай адукацыі задае пытанне: «Хто ў лесе жыве?» — і гульня ідзе нанова.

*Дзецям прапануюць размалёўкі «Сасна».*

# СІМВАЛЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

## ІНТЭГРАВАНЫЯ ЗАНЯТКІ ПА АДУКАЦЫЙНЫХ АБЛАСЦЯХ «ДЗІЦЯ І ГРАМАДСТВА» І «РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ І КУЛЬТУРА МАЎЛЕНЧЫХ ЗНОСІН» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (6—7 гадоў)

**Праграмныя задачы:** фарміраваць уяўленні дзяцей пра сімвалы беларускай дзяржавы (гімн, герб, сцяг); замацоўваць уменне граматычна правільна будаваць звязныя выказванні; развіваць увагу, пазнавальную актыўнасць; выхоўваць паважлівыя адносіны да сімвалаў беларускай дзяржавы, патрыятычныя пачуцці.

**Матэрыял і абсталяванне:** мальберт, карта Беларусі, карткі з выявамі: Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, каласоў жыта, кветак (лён, канюшына, васількі, рамонкі), зорак (пяцiканцовая, шасціканцовая), сонца, месяца, зямнога шара, чырвона-зялёнай стужкі, контуру межаў Беларусі і Расіі, аўдыязапіс Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь (сл. М. Клімковіча, У. Карызны, муз. Н. Сакалоўскага), па колькасці дзяцей: папяровыя сілуэты кветак, наборы каляровых алоўкаў.

### Ход заняткаў

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Сёння я раскажу вам легенду. Нарадзіліся ў маці тры сыны. Задумалася маці: якія імёны даць сынам, у якое адзенне прыбраць. «Ты, сынок, — сказала маці першаму, — насі адзенне, па якім усе будуць пазнаваць нашу багатую і мужную зямлю». І прыбрала яна сына ў чырвона-зялёна-белую вопратку, заззяла на ёй чырвоная зорка. «Беражы яе, — сказала маці, — і глядзі, каб ніколі-ніколі не згасла зорка, бо з ёю ў сэрцы змагаўся наш народ за вольнае жыццё, за сонечнае неба». «А цябе, сынок, — сказала маці другому сыну, — буду прасіць, каб насіў маю карону. Я спляла яе з жытняга калосся, кветак канюшыны, ільну, якімі квітнее наша зямля». І надзела яму на галаву карону. «А ты, мой галасісты сынок, будзеш спяваць маю самую любімую, дарагую песню», — папрасіла маці сына трэцяга і падарыла яму ноты і словы песні. Потым маці звярнулася яшчэ раз да сваіх малайцоў: «Ты, сынок першы, будзеш вядомы ў нашай Дзяржаве пад іменем Сцяг. Ты, сынок другі, будзеш называцца Гербам. Ты, сынок трэці — Гімнам».

Так і жывуць у маці тры сыны — Сцяг, Герб, Гімн. Хто іх маці, як яе называюць? *(Беларусь.)*

Наша краіна — адна з многіх дзяржаў свету, яе поўная назва — Рэспубліка Беларусь. У Рэспубліцы Беларусь ёсць свае адметныя, вызначальныя дзяржаўныя сімвалы: гімн, герб, сцяг.

Ці ведаеце вы, што такое гімн? *(Адказы дзяцей.)* Гімн — гэта ўрачыстая песня, якая выконваецца ў гонар краіны як даніна павагі да

яе народа. Таму падчас выканання гімна ўсе людзі ўстаюць. Гімн ёсць у кожнай краіны. Давайце паслухаем наш гімн.

*Дзеці і педагагічны работнік устаюць, слухаюць урывак аўдыязапісу Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.*

**В.д.а.** Гучыць урачыста,
Як водгукі славы,
Гімн нашай вячыстай
Цудоўнай дзяржавы.

Пад гукамі Гімна
Я моўчкі клянуся
Сапраўдным быць сынам
Маёй Беларусі.

**М. Пазнякоў**

Паглядзіце на Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь. *(Сумесна разглядаюць картку з выявай.)* На гербе акрэслены зялёны контур граніц Беларусі ў залатых промнях сонца над зямным шарам. Гэта сімволіка зразумела кожнаму: усе свае думкі грамадзяне накіроўваюць да Айчыны: гэта наша зямля, нам чужой не трэба, але сваёй мы не аддадзім. Зверху размешчана чырвоная пяціканцовая зорка — сімвал чалавека і чалавецтва, знак мужнасці. Жытнія каласкі, жыта — гэта наш хлеб, аснова жыцця, сімвал мірнай працы. Сінявокі лён здавён вырошчваюць у Беларусі, з яго ткуць палатно для адзення. Канюшына — сімвал сувязі са светам жывёл. Вянок на дзяржаўным гербе ўтвораны з жытніх каласоў. Яны абвіты чырвона-зялёнай стужкай, якая сімвалізуе колеры сцяга Беларусі, на ёй залатымі літарамі напісана: «Рэспубліка Беларусь». Ніжэй контуру тэрыторыі Рэспублікі Беларусь змешчаны зямны шар з узыходзячым над ім сонцам і залатымі промнямі. Гэта знак таго, што Рэспубліка Беларусь гатова сябраваць з усімі народамі Зямлі.

## Гульня «Самы пільны»

Дзецям прапануюць карткі з выявамі каласоў жыта, кветак (лён, канюшына, васількі, рамонкі), зорак (пяціканцовая, шасціканцовая), сонца, месяца, зямнога шара, чырвона-зялёнай стужкі, контураў межаў Беларусі і Расіі. Неабходна выбраць карткі, на якіх адлюстравана тое, што ёсць на выяве Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь. Затым на мальберце размяшчаецца картка з выявай герба, дзеці правяраюць, ці правільна выканалі заданне.

Выхавальнік дашкольнай адукацыі ў час гульні нагадвае, што сімвалізуе кожны элемент.

## Фізкультмінутка «Родны край»

Неба чыстае і глыбокае
*(Уздымаюцца на дыбачкі, гойдаюцца з бока ў бок.)*
І бярозавы ціхі гай —
*(Паварочваюцца вакол сябе ўлева, потым управа.)*
Беларусь мая сінявокая,
*(Крочаць на месцы, пляскаюць у далоні.)*
Беларусь мая, родны край.
*(Падскокваюць на месцы.)*

**У. Карызна**

**В.д.а.** Ці бачылі вы раней герб нашай краіны? Дзе? *(Адказы дзяцей.)* Малайцы, вы вельмі ўважлівыя. Герб упрыгожвае ўсе ўрадавыя і навучальныя ўстановы, яго можна ўбачыць на дзяржаўных дакументах. Выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь ёсць на пагранічных слупах.

Дзяржаўны герб, як сонца, свеціць
У нашым сэрцы, над зямлёй.
І Беларусь у белым свеце
Нязгаснай славіцца красой...

## Гульня «Так ці не»

Выхавальнік дашкольнай адукацыі называе расліны. Калі дзеці чуюць назву той, якая адлюстравана на гербе Беларусі, яны падскокваюць на месцы, у астатніх выпадках тупаюць.

*Выхавальнік дашкольнай адукацыі дэманструе дзецям картку з выявай Дзяржаўнага сцяга Беларусі.*

**В.д.а.** А вось — сцяг нашай краіны. Якія колеры ён мае? *(Чырвоны, зялёны і белы.)* Узгадайце, што азначае белы колер? *(Свабоду.)* Да таго ж, белы колер — гэта колер мудрасці. Што нагадвае вам зялёны колер? Чырвоны? *(Адказы дзяцей.)* Зялёны колер — гэта колер прыроды, нашых лясоў і палёў, якія здаўна займаюць асноўную частку краіны, колер працы. Чырвоны колер служыць знакам сонца, крыві, брацтва, адвагі, адначасова гэта знак шчаслівага жыцця.

...Таму ў нашым Сцягу
Тры колеры маем.
Сардэчнасць, адвагу,
Мір, працу вітаем.

**М. Пазнякоў**

Сцяг Беларусі мае яшчэ адну важную дэталь: старажытны народны арнамент чырвонага колеру. У ім — талент народа, і праца, і слава, і замова на ўраджай, на шчасце. Дзе вы бачылі Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь? *(Адказы дзяцей.)* Сцяг заўсёды ўзняты над будынкамі дзяржаўных і навучальных устаноў, прадпрыемстваў, вайсковых часцей і г.д. Ніводнае свята не абыходзіцца без сцяга. Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь падымаецца ў час спартыўных спаборніцтваў, калі перамагаюць беларускія спартсмены.

### Гульнявое практыкаванне «Кветкі — Радзіме»

Дзецям прапануюць узяць папяровыя сілуэты кветак, расфарбаваць іх у колеры свайго настрою: чырвоны — захапленне, зялёны — спакой, жоўты — радасць, і падарыць добры настрой сваёй Радзіме — прымацаваць кветку на карту Беларусі.

# СЦЯГ РОДНАЙ КРАІНЫ

## СІТУАЦЫІ ЗНОСІН ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРШАЙ ГРУПЫ (6—7 гадоў)

**Мэта:** замацаванне ўяўленняў дзяцей пра Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь.

**Сітуацыя 1.**

**Матэрыял:** ілюстрацыя з выявай Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, малюнкі-асацыяцыі да чырвонага колеру (зорка, стужка, полымя), фотаздымкі аб Вялікай Айчыннай вайне.

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Разгледзьце выяву Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Самая шырокая яго палоска мае... *(чырвоны колер)*. З даўніх часоў гэты колер служыць знакам шчаслівага жыцця. Для беларусаў гэта яшчэ і колер сцягоў атрадаў Чырвонай Арміі, беларускіх партызан, якія змагаліся супраць ворагаў за свабоду і незалежнасць.

*Педагагічны работнік знаёміць выхаванцаў з апавяданнем з кнігі «Твае абаронцы» Л. Касіля. Дэманструе фотаздымкі аб Вялікай Айчыннай вайне.*

**В.д.а.** Пад мірным небам мы жывём,
Гуляем, вучымся, пяём,
Але шмат год таму назад
Прыйшоў у наш край чужы салдат.
Закатавалі шмат людзей,
Старых забілі і дзяцей.
Былі тут жорсткія баі,
Каб мы шчаслівымі жылі.
Фашыстаў прадзеды разбілі,
Чужынцаў армію знішчылі,
У баях перамаглі,
Краіне гонар здабылі.

**Я. Жабко** *(перапрац.)*

**Сітуацыя 2.**

**Матэрыял:** ілюстрацыя з выявай Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, малюнкі-асацыяцыі да белага колеру (вопратка, бярозы, снег, воблака, рамонкі, квітнеючы сад), карткі з узорамі арнаменту, па колькасці дзяцей: лісты белай паперы, элементы беларускага арнаменту.

**Выхавальнік дашкольнай адукацыі (В.д.а.).** Паглядзіце на Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь. Вертыкальна на ім размешчаны беларускі нацыянальны арнамент чырвонага колеру на белым полі. Белы колер — гэта сімвал... *(свабоды, чысціні і мудрасці)*.

### Гульнявое практыкаванне «Асацыяцыі»

Дзецям прапануюць падабраць малюнкі-асацыяцыі да белага колеру беларускага сцяга (белая вопратка, белыя бярозы, белы снег, белае воблака, белыя рамонкі, белы колер квітнеючага саду) і прыдумаць сказы аб іх.

*Выхавальнік дашкольнай адукацыі знаёміць выхаванцаў з вершам «Белая Русь мая» У. Скарынкіна:*

Белая Русь мая!
Чыстая ты мая!
Родная ты мая!
Белыя гоні бульбы,
Белыя косы дзяўчат.
Воблакаў белых над Бугам
Вечны парад.
Белых грыбоў кашолкі,
Белыя плечы бяроз,
Белыя россыпы золкіх
Чыстых світальных рос.
Вейкі рамонкаў белых,
Белыя грывы завей.
Чыстыя душы смелых,
Простых тваіх людзей.

**В.д.а.** На Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь адлюстраваны арнамент. У яго цэнтры — элемент «ромб з кручкамі» — гэта сімвал засеянага поля. Крыж унутры ромба сімвалізуе сонца: «Узыдзі сонейка, сагрэй нашу зямельку, дай нам багаты ўраджай». Увогуле ўзор называецца «Узыходзячае сонца». Ён заклікае ўдачу і здзяйсненне добрых жаданняў.

*Дзецям прапануюць скласці па ўзоры на лісце белай паперы з асобных элементаў беларускі арнамент.*

ЛІТАРАТУРА:

1. *Дубініна, Д.М.* Культура Беларусі ў казках і паданнях: этнакультурная адукацыя дашкольнікаў: дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкольнай адукацыі / Д.М. Дубініна, Д.У. Дубінін. — Мінск: Зорны верасень, 2008.
2. *Дубінін, Д.У.* Мая родная старонка: дапам. для педагогаў дашкольных устаноў / Д.У. Дубінін, Д.М. Дубініна. — Мінск: Полымя, 2000.